# У СУДАКРАНАННІ З ПРАСТОРАЙ І ЧАСАМ




**У гродзенскіх школах пачаліся прэзентацыі кнігі «Песнярам Айчыны», зборніка твораў-прысвячэнняў пісьменнікаў Гродзеншчыны класікам беларускай літаратуры.**

Мінулы год быў багаты на знакавыя юбілейныя даты – 140-годдзе Янкі Купалы і Якуба Коласа, 110-годдзе Максіма Танка. У гэтым юбілейным календары імёны выдатных пісьменнікаў нашай Гродзеншчыны – Янка Брыль, Уладзімір Калеснік, Адам Мальдзіс, Анатоль Іверс і інш. Гэты каляндар стаў адпраўной кропкай ідэі стварэння зборніка твораў-прысвячэнняў «Песнярам айчыны». Сама задума і шчыраванне па яе рэалізацыі належаць кіраўніку пісьменніцкай супольнасці Гродзеншчыны, пісьменніцы Людміле Кебіч. Кнігу ж склалі творы 27-мі аўтараў. У прадмове да зборніка старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч адзначыў, што прысвячэнні не толькі выяўляюць захопленасць аўтараў мастацкай спадчынай, але «і падштурхоўваюць да разваг, прымушаюць разглядаць творчыя здабыткі ў судакрананні з прасторай і часам», бо час многаму надае новыя сэнсы, акрэслівае вартасць, пацвярджае каштоўнасць. Якраз гэта акалічнасць і выклікала цікавасць да зборніка ў настаўнікаў, а праз іх і ў вучняў. У прыватнасці ў сярэдняй школе № 12 г. Гродна, дзе стала трывалай традыцыяй праводзіць прэзентацыі новых кніг, асабліва рэгіянальных аўтараў, настаўнікі не толькі расказалі аб зборніку «Песнярам айчыны» і яе аўтарах, але і далі магчымасць вучням,

пазнаёміўшыся са зместам, зачытаць тыя творы-прысвячэнні, якія іх найбольш уразілі. Настаўніца Алена Анатольеўна Кедзік *(на фота)* зазначыла, што дзецям якраз і падабаюцца зборнікі, бо знаёмячыся з такімі выданнямі, яны маюць магчымасць выбару, самі вызначаюць, што змогуць выкарыстаць на ўроках, пра што паразважаць, абмеркаваць, выказаць свае думкі.



Настаўнікі ацанілі выданне як своеасаблівы наглядны дапаможнік. З уласнага вопыту яны ведаюць, якое важнае значэнне пры вывучэнні жыццёвай і творчай біяграфіі пісьменніка набываюць так званыя вершаваныя партрэты. Аб гэтым прафесар А. І. Бельскі пісаў, што «аўтары вершаваных партрэтаў імкнуцца адкрыць і адчуць жывы змест творчай і жыццёвай дзейнасці песняра, вытлумачыць феномен яго мастакоўскай сілы, народнасці і неўміручасці створанага ім мастацтва».

Увогуле ж праведзеныя прэзентацыі паказалі, што зборнік «Песнярам айчыны» можна плённа выкарыстоўваць на ўроках літаратуры, на пазакласных мерапрыемствах і ў рамках прадметнага тыдня.

**Алена РУЦКАЯ**
Заслужаны настаўнік Беларусі,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі



**На фота:** «Песнярам айчыны», зборнік твораў-прысвячэнняў пісьменнікаў Гродзеншчыны класікам беларускай літаратуры: знаёмства з кнігай у гродзенскай сярэдняй школе № 12 імя В. У. Бабко. Люты 2023 года.


ПЕСНЯРАМ АЙЧЫНЫ
BLACK


Песнярам Айчыны


ПЕСНЯРАМ АЙЧЫНЫ






Песнярам Айчыны
Зборнік твораў - прысвячэнняў
пісьменнікаў
класікам